# Сістэмныя выклікі для беларускага грамадства і ўрада ў перыяд палітычных змен у Беларусі

## Эсэ выпускніка курсу "Публічная палітыка для пачаткоўцаў"

*"Поспех – яшчэ не кропка, параза – не канец, значэнне мае толькі мужнасць працягваць барацьбу". У.Чэрчыль*

Нягледзячы на прыведзенае выказванне Уінстана Чэрчыля, у гэтым эсэ не будзе разглядацца тая частка барацьбы, праз якую вымушаны будуць адбыцца палітычныя змены ў Беларусі. Я свядома прапаную ўмоўна пераскокнуць праз сёняшні драматычны перыяд, які заслугоўвае асобнага аналізу шмат якіх фактараў, на шмат з якіх уплыў беларускага грамадства ўнутры краіны ўжо, на жаль, не вялікі. Ніжэй будуць тэзісна выкладзены мае асабістыя меркаванні адносна таго, як падрыхтавацца да адчынення "вакна магчымасцяў" і здзейсніць палітычныя змены найбольш паспяхова, рэальна, без папулізму, але і не вельмі балюча, каб ператварыць Беларусь у цывілізаваную, квітнеючую еўрапейскую дзяржаву.

Сённяшняе становішча беларускага грамадства я б характарызаваў як крытычна небяспечнае для перспектыў самога яго існавання – прапаную гэта лічыць самым галоўным сістэмным выклікам.

Тое, што дзяржавай кіруе ўрад, які дазволіў крытычную эканамічную залежнасць ад адной дзяржавы і нават акупацыю сваёй краіны, ажыццявіў знішчэнне грамадскай супольнасці і рэпрэсіі супраць свайго народу, стаў на бок агрэсара і падстаўляе краіну пад ядравы ўдар - усё гэта з'яўляецца наступствам і следствам хваробнага стану як індывідаў грамадства, так і супольных еднасцяў. Не аналізую тут глыбока прычыны гэтых "хвароб", таксама як і не пералічваю адмысловыя якасці майго народа – нацыі выжыўшых. Пазначу толькі, што цалкам не згодзен з папулісцкім выказваннем "кожны народ варты свайго ўрада". Вызначу тры найбольш характэрныя "хваробы", уласцівыя большасці беларускага грамадства, і толькі дзеля таго, каб абгрунтаваць шляхі іх лекавання. Знутры краіны мне - інжынеру, канструктару, прадпрымальніку і вынаходніку (55+) - бліжэй іншыя тэрміны: план капітальнага рамонту, рэструктурызацыі і пошуку ідэй. Таму пералік такі:

1. Нясталая, слабая, праблемная нацыянальная ідэнтычнасць.
2. Апалітычнасць, гістарычная, эканамічная і экалагічная неадукаванасць.
3. Прыстасаванства, спадзяванні на разумнага начальніка/прэзідэнта/цара/захад/цуд.

*Нацыянальная ідэнтычнасць.* Негледзячы на навейшы перыяд аднаўлення незалежнай беларускай дзяржавы, большасць суграмадзян краіны толькі пару гадоў

таму здолелі ўсвядоміць сябе беларусамі – замест ранейшай сарамлівай тутэйшасці і нават рускасці. Пры тым, што ў нас існуе культ продкаў, мала хто з беларусаў ведае свае карані далей за прадзеда, далей за савецкія і польскія часы. Нашыя бацькі часцей замоўчвалі свае гісторыі рода,  вельмі асцярожна распавядалі пра апошнюю вайну і партызаншчыну, з гумарам называлі "палякамі" тых, хто наведваў касцёл, і "рускімі" – хто царкву.  Маючы ў адной кішэні партыйны білет, а ў другой – дулю, яны таемна хрысцілі нас, будучых дзяцей "развітога сацыялізму", перабудовы і незалежнасці. На жаль, перыяд чарговага адраджэння незалежнай нацыянальнай дзяржавы быў кароткім, пасля 1990 года доўжыўся ўсяго 4-5 гадоў.

Дзякуючы жаданню лепшага жыцця для сваіх дзяцей і даверу нашых бацькоў наймаладзейшаму прэзідэнту, "які з народа і супраць карупцыі", стартаваў новы гістарычны этап, вынікі якога мы зараз назіраем. Таму, з аднаго боку, паспела вырасці маладое пакаленне з нацыянальнымі каштоўнасцямі, з ведамі пра Рэч Паспалітую, ВКЛ, Полацак, літвінаў, балтаў і русічаў. З другога боку, перыяд быў настолькі хуткім і крызісным, што для большасці працаздольнага насельніцтва скарачэнне ВКЛ у 1991 годзе выклікала асацыяцыю з выключальнікам на сцяне… Вельмі марудна, праз кнігі, часопісы, імпрэзы, дзякуючы апантанасці прафесійных гісторыкаў і аматараў, расчынялася "скрынка Пандоры" – наша нацыянальная гісторыя. Праблемная ідэнтычнасць палягае ў дасюль невырашанай, траўматычнай для сфармаванай расейскай імперскай адукацыяй свядомасці грамадзян сучаснай Беларусі: пытаннях роднай мовы, пытаннях вакол Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай ("Ці нашыя гэта дзяржавы і гісторыя?"), удзелу насельніцтва ў паўстаннях супраць Расейскай Імперыі, гісторыі БНР, змагання з бальшавізмам, "партызанка" і савецкае дысідэнцтва. Без паразумення сучаснымі беларусамі сваіх каранёў ("хто яны і адкуль?"), без вызначэння сваёй ідэнтычнасці як найстарэйшай еўрапейскай нацыі з магутнай гісторыяй і дэмакратычнымі традыцыямі немагчыма пабудова ніякай нацыянальнай дзяржавы, толькі пратэктарат, што і зараз.

*Апалітычнасць*. "Я ў палітыку не лезу" – найчасцей казалі ў СССР. Мала што змянілася для большасці і цяпер. Таму "палітыка" залезла ў кожны дом, у кожную асобную кішэню і нават узяла кожнага ў свае закладнікі.

*Прыстасаванства, спадзевы на вонкавыя абставіны і "мудрага кіраўніка".* У нас - нацыі выжыўшых - існуе не толькі культ продкаў, але і паказна-фармальны, з выгадай для сябе культ начальства, якому быццам лепш усё вядома, якое разумнейшае і зробіць "усё як мае быць". Адсюль вынікае нежаданне вывучаць нейкую там публічную палітыку, асновы эканамічнай, экалагічнай пісьменнасці – "там, зверху, ўсё вырашаць і без нас". Гэта з аднаго боку апалітычнасць, а з другога - агромісты недавер і прорва паміж грамадзянам і ўладай, у якую не хочацца "запэцкацца". У сённяшніх умовах, калі інстытут грамадзянскай супольнасці амаль цалкам знішчаны, а краіна адкінута на узровень таталітарна-падданічнай дзяржавы з фармальным суверэнітэтам, гэтая прорва толькі павялічылась і пагражае кожнаму нязгоднаму ўжо фізічным існаваннем. Каб фізічна выжываць, насельніцтву ўнутры краіны і надалей прыйдзецца прыстасоўваць сваё жыццё пад вонкавыя абставіны, заўгодна якую ўладу і патаемна марыць пра цуд…

Як казаў паэт, “А цуда ня будзе…”. Засталося зразумець хто, што і як зможа вылечыць грамадства, адрамантаваць і рэфармаваць дзяржаву. Мае прапановы наступныя. Каб быць гатовымі да моманту адчынення вакна магчымасцяў, трэба ўжо зараз (а лепей – “учора”) заснаваць тры Адчыненых Інстытута з вольным доступам да карыстання іх інфармацыяй. Гэта інстытуты:

1. Гістарычнай Памяці.
2. Прапаганды і контрпрапагадны.
3. Рэформ.

У цяперашніх умовах заснаваць іх магчыма толькі за мяжой, сіламі дыяспар, апазыцыі, на сродкі дабрачынных фундацый і міжнародных фондаў. На пачатку гэтыя ўстановы могуць працаваць як інфармацыйныя і асветніцкія арганізацыі, пазней – ператварыцца ў Беларусі ў дзеючыя Навуковыя Інстытуты, якія будуць выпрацоўваць праграмы нацыянальнага развіцця, галоснасці і інфармацыйнай бяспекі, эканамічных і палітычных рэформ.

Інстытут Гістарычнай Памяці, акрамя іншага, павінен мець аддзяленне, дзе зафіксуюцца ўсе злачынствы супраць народа Беларусі, у тым ліку і сённяшняга рэжыму, што спатрэбіцца ў далейшым пры правядзенні судоў і люстрацыі ў новай краіне.

Інстытут Прапаганды і контрпарпагадны стане рупарам улады рэформ і будзе садзейнічаць тлумачэнню бачання новай краіны, прывабнай для насельніцтва, бізнэса, інвестараў і суседзяў, процідзейнічаць разбуральнай для нацыянальных інтарэсаў і ўстойлівага развіцця дзейнасці.

Інстытут Рэформ падбярэ і адаптуе падыходзячыя мадэлі паспяховага дзяржаўнага будаўніцтва, выпрацуе план іх фінансавання і ўкараніць стандарты іх паэтапнай рэалізацыі. Гэта рэформы заканадаўчай, выканаўчай і судовай улад, рэформы СМІ, царквы, адукацыі, адміністрацыйнага дзялення, мясцовага самакіравання, падаткаабкладання, сацыялагічных даследванняў і іншыя.

Лічу, што ў Беларусі няма і ня будзе часу на выпрацаванне ўнікальных рэформаў, таксама як і няма на сённяшні час дастатковай колькасці спецыялістаў, якія б гарантавалі паспяховую рэалізацыю такіх рэформ ва ўмовах сённяшняга становішча краіны. Таму кардынальным рашэннем было б запрашэнне замежных вонкавых спецыялістаў у Інстытут Рэформ для ўкаранення падыходзячых мадэляў паступовага рэфармавання грамадства і дзяржавы - без сацыяльных выбухаў і глыбокіх крызісаў, пры падтрымцы міжнародных праграмаў і фондаў. Адначасова з гэтым трэба падрыхтаваць дастатковую колькасць уласных нацыянальных спецыялістаў і кіраўнікоў. Такім чынам, пераходны перыяд рэформ, на маю думку, павінен быць заснаваны на навуковым падыходзе, доўгатэрміновых планах развіцця і выкарыстоўванні эфектыўных стандартаў працы ўрада пераходнага перыяду. Гэта не тая самая надзея на некага звонку, пра якую я раней узгадваў, як пра “хваробу”, а мой уласны досвед: без правераных стандартаў і іх трапнага, адказнага выканання, тым

больш у доўгатэрміновай перспектыве, укараніць інавацыі проста немагчыма, тым больш рэформы, закранаючыя кожнага.

На першым этапе рэформ (1-2 гады) павінны быць зацверджаны і гарантаваны верхавенствы Закона, асноўных прынцыпаў Правоў Чалавека - як падмурак новага законадаўства і канстытуцыі. Выпрацаваны і абаснаваны перад грамадствам вобраз новай дзяржавы, праграмы рэформ, іх бюджэт і фінансаванне, адноўлена грамадская супольнасць, палітычныя партыі, падзел улады, парламент. Праведзена люстрацыя і суды над злачынцамі, асуджана роля кампартыі. На другім этапе (8-9 год) - ажыццявіць незваротныя сістэмныя змены ў эканоміцы і грамадстве для дасягненння эканамічнага росту. На трэцім этапе (10-20 гадоў) краіна будзе ў стане пачаць вяртанне фінансавых сродкаў, выдаткаваных міжнароднымі фінанасавымі ўстановамі на праграму рэформ з прыбытковай частцы бюджэту.

Маё уласнае бачанне палітычнай канструкцыі новай краіны – нацыянальная ліберальна-дэмакратычная еўрапейская дзяржава, парламенцкая Рэспубліка з прыярытэтам асноўных свабод асобы, правоў чалавека і ўласнай маёмасці. Нацыянальная ідэя – згодзен з Паўлам Севярынцам – “Еўрапейская форма, Хрысціянскі змест”. Найбольш распрацаванай на сёння лічу праграму “Вольная Беларусь”.

/ Master Yoda /    21.06.2023